## Библиографические ссылки

1. Панченко С. А. Роль региональной прессы в росте социально-коммуникативного спроса на экологическую информацию // Научн.-производст. журн. Сер. : Социальные коммуникации. 2017. № 1. С. 101–104.
2. Паславский И. И. Местная официальная пресса: отягощающее прошлое и смутное будущее // Вестник Львовского университета. Сер. : Журналистика. 2007. Вып. 30. С. 242–252.
3. Терещенко И. Региональные СМИ: проблемы и перспективы // Научные работы Национальной библиотеки Украины им. В. И. Вернадского. 2018. Вып. 27. С. 174–180.
4. Региональная пресса опережает национальную – АНРВУ [Электронный ресурс]. URL: http://detector.media/withoutsection/article/73884/2012-08-03-regionalna-presa-viperedzhae-natsionalnu-za-auditorieyu-odnogo-nomera-anrvu (дата обращения: 27.05.2019).


# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ Ў ГАЗЕЦЕ «СОЮЗНОЕ ВЕЧЕ»


***В. М. Самусевіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*samusevich@bsu.by*



У матэрыяле даследуецца газетны тэкст як від дыскурсу, які ў працэсе канцэптуалізацыі рэчаіснасці каштоўнасна арыентуе свайго чытача. Медыядыскурс не толькі стварае нацыянальную мадэль свету, але і фарміруе адносіны да яе.



***Ключавыя словы:*** медыятэкст; дыскурс; канцэпт; канцэптуалізацыя; газета.


# CONCEPTUALIZATION IN NEWS PAPER «SOUZNOJE VECHE»


***V. M. Samusevich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. M. Samusevich (samusevich@bsu.by)*



The article analyses a newspaper text as a kind of discourse which provides guidelines to the readers in the matters of values of the contemporary world. It creates the national model of the world and forms the attitude to it.

***Keywords:*** media text; discourse; concept; conceptualization; newspaper.

У эпоху глабалізацыі, лічбавізацыі і інтэнсіфікацыі дэмакратычнага руху публіцыстычнае слова набывае асаблівае значэнне. Новы час патрабуе новага асэнсавання як нацыянальных каштоўнасцяў, так і тых працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве і свеце. У гэтых адносінах важная роля адводзіцца журналістыцы.

Нацыянальная культура народа як матэрыяльная і духоўная каштоўнасць вербалізуецца ў публіцыстычным маўленні, якое змяшчае ключавыя словы культуры – канцэпты.

Менавіта масава-інфармацыйны кантэкст стварае ўмовы для адэкватнага разумення канцэпту: слова, якое часта тыражыруецца, становіцца канцэптам толькі ў працэсе камунікацыі, паколькі камунікацыя прыводзіць у дынаміку канцэнтрат пэўных уяўленняў, асацыяцый, пачуццяў, якія суправаджаюць канцэпт.

Слова ў пэўным значэнні, факусуючы ў сабе толькі нейкую частку інфармацыі з канкрэтнай сітуацыі (частку інфармацыі актуалізуючы, высвечваючы, а частку прыхоўваючы, адводзячы на задні план), прадстаўляе адмысловы спосаб канцэптуалізацыі, інакш кажучы – ключавое слова з’яўляецца пэўнай семантычнай мадэллю сітуацыі, якае мае дакладную канатацыю і кагнітыўную характарыстыку. Такім чынам адбываецца працэс канцэптуалізацыі рэчаіснасці, які заключаецца ў асэнсаванні інфармацыі, структураванні ведаў аб свеце, інтэрпрэтацыі з’яў рэчаіснасці пры дапамозе канцэптаў. Канцэпт як універсальны код прэзентуецца ў журналісцкім тэксце.

Для аналізу мы ўзялі два нумары (адзін з іх спецвыпуск) газеты Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі «Союзное вече» (27.09.2019). Агульны пасыл выдання зразумелы, ён абумоўлівае і набор ключавых слоў-канцэптаў, якія арганізуюць інфармацыйны цэнтр і ствараюць семантычнае поле газетнай паласы – *Саюзная дзяржава, аб’яднанне, інтэграцыя, брацкае сяброўства, партнёрскія адносіны, давер, яднанне, славянскія карані, умацаванне, падтрымка, адна сям’я, супрацоўніцтва, агульная гістарычная памяць, добрасуседства* і пад.

Усе ключавыя словы маюць станоўчую канатацыю і канструктыўную змястоўнасць, накіраваную на кагнітыўную кансалідацыю чытацкай аўдыторыі.

Для замацавання канцэптуальнага зместу важнай стратэгіяй становіцца выбар аўтара/прамоўцы. Аўтарытэтны, вядомы чалавек, культурны ці палітычны дзеяч, знакаміты і любімы акцёр – усё гэта асо-

бы, вуснамі якіх праводзіцца ідэя/канцэпт і замацоўваецца ў чытацкай свядомасці. Так, пра інтэграцыю Расіі і Беларусі гаворыць У. Сямашка: «Нашы сувязі будуць ушчыльняцца, станавіцца цяснейшымі, каб мы сталі мацнейшымі і жылі ў лепшых умовах» (27.09.2019). Ці дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Р. Рапота: «Саюзная дзяржава стварае магчымасці для зносін моладзі Беларусі і Расіі, паколькі інтэграцыя нашых краін павінна сустракаць падтрымку найперш у новых пакаленняў» (27.09.2019). Падобная рыторыка спрыяе канцэптуалізацыі напрамкаў дзяржаўнай палітыкі і фарміруе грамадскую думку ў канструктыўным ключы.

Цэнтральная тэматыка падтрымліваецца візуальнымі прыёмамі. Напрыклад, у назве выдання дзве першыя літары маюць сімвалічнае каляровае рашэнне, адсылаючы да сцягоў Беларусі і Расіі. Візуальная тэндэнцыя прасочваецца ва ўсіх нумарах выдання і максімальна ўкараняецца ў візуальна-графічную канцэпцыю выдання. Так, у спецыяльным выпуску газеты на першай паласе мы бачым, акрамя назвы выдання, у верхнім левым кутку лагатып XIV фестывалю «Моладзь – за Саюзную дзяржаву» са стужкамі, што нагадваюць сцягі дзвюх краін; на цэнтральным здымку дзеці, якія трымаюць плакаты з намаляванымі сцягамі Расіі і Беларусі.

Маўленчая формула (інтэграцыя, моладзь, рэгіёны, інш) «…Расіі і Беларусі», «…Беларусі і Расіі» пастаянна паўтараецца, асабліва ў моцных пазіцыях медыятэксту – загалоўках, лідах, рубрыках. Напрыклад, загаловак «Вясёлыя рабяты» лід «Фестываль «Моладзь – за Саюзную дзяржаву» сабраў у Растове-на-Доне тры сотні таленавітых рабят з усіх куткоў Расіі і Беларусі»; загаловак «Доўг радзімы», лід «У каго і на якія мэты бяруць займы за мяжой Расія і Беларусь» і інш. (27.09.2019). Гэты прыём высвечвае ключавую ідэю ўсіх матэрыялаў: Беларусь і Расія – Саюзная дзяржава.

Журналісцкі тэкст павінен каштоўнасна арыентаваць свайго чытача, ствараючы не толькі пэўную мадэль свету, але і фарміруючы адносіны да яе. Напрыклад, дамінантны канцэпт «моладзь», вынікаваны інфармацыйнай нагодай – маладзёжны фестываль, прадстаўлены ў выданні наступным чынам: «адкрытая, гатовая да любых здзяйсненняў моладзь», «рабяты з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія хочуць ісці ў нагу з часам», «рабяты, якія лічаць неабходным зрабіць свой уклад ў захаванне нашай агульнай культурнай, гістарычнай і духоўнай спадчыны», «таленавітыя, поўныя ідэй», «нашы рабяты нераўнадушныя, крэатыўныя, умеюць браць адказнасць за свае ўчынкі», «актыўныя,

таленавітыя, яркія рабяты», «шчырыя і сапраўдныя» і інш. У падобных прыкладах мы можам назіраць механізм кагнітыўнай рэканструкцыі канцэптуальных адзінак, які забяспечвае зрух «фокусу ўвагі» ў структуры канцэптаў на канкрэтныя характарыстыкі.

Аналіз нумароў газеты «Союзное вече» засведчыў, што сёння канцэптуальная журналістыка выконвае асаблівую, сацыяльную функцыю. Яна з'яўляецца ключавым пасрэднікам, «медыятарам» паміж уладай і грамадствам. З аднаго боку, журналістыка адлюстроўвае грамадскую думку, тым самым уплывае на выпрацоўку ўпраўленчых рашэнняў органамі ўлады. Але з другога боку, менавіта журналістыка і фарміруе грамадскую думку, уключаючы канцэптуальную інфармацыю ў масавую свядомасць, праводзячы праз свае каналы дзяржаўныя канцэпцыі і нацыянальныя ідэі.

Залежнасць ментальных механізмаў інтэрпрэтацыі і асэнсавання моўных адзінак, якія цыркулююць на газетнай паласе, спосабаў канцэптуалізацыі і прынцыпаў функцыянавання канцэптаў з'яўляецца перадумовай далейшага вывучэння медыядыскурсу як працэсу камунікатыўна-кагнітыўнага ўзаемадзеяння і канцэптуальнай журналістыкі як уплывовага фактару пабудовы нацыянальнай карціны свету.

# МЕДИАОБРАЗОВАНИЕ И ПРОФОРИЕНТАЦИОННАЯ ЖУРНАЛИСТСКАЯ ПОДГОТОВКА ШКОЛЬНИКОВ (на примере деятельности НДЦ «Зубрёнок»)

***Н. В. Саянова***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*natumi@mail.ru*

Анализируется роль медиаобразования как элемента дополнительного образования на примере деятельности НДЦ «Зубрёнок». Утверждается необходимость включения элементов медиаобразования в учебный процесс для формирования личностных и первичных профессиональных навыков школьников в условиях динамично развивающейся конвергентной информационной среды.

***Ключевые слова:*** медиаобразование; НДЦ «Зубрёнок»; информационная культура; профессиональные компетенции.